# РАЗДЗЕЛ 2

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА: СУЧАСНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ

## САЦЫЯЛЬНАЕ СТАНАЎЛЕННЕ ДЗІЦЯЦІ Ў АПОВЕСЦЯХ А. ВАСІЛЕВІЧ «ДОЛЯ ЗНОЙДЗЕ ЦЯБЕ» І «НОВЫ СВЕТ»

**Л. В. Алейнік**

*Кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,*
*lada_oleinik@mail.ru*

Разглядаюцца аповесці А. Васілевіч «Доля знойдзе цябе» і «Новы свет» – цэнтральныя часткі тэтралогіі «Пачакай, затрымайся». Даследуюцца абставіны жыцця, сямейных узаемаадносінаў і этапы сацыяльнага станаўлення галоўнай гераіні твора – вясковай дзяўчынкі. Аналізуюцца падзеі і фактары, якія садзейнічалі засваенню юнай гераіняй сацыякультурнага вопыту і яе інтэграцыі ў сістэму сацыяльных адносінаў. Сцвярджаецца, што літаратурныя творы А. Васілевіч дазваляюць глыбей асэнсоўваць і засвойваць з’явы і законы сацыяльна-грамадскага быцця, вызначаюць этычныя абсалюты, якія рэгламентуюць чалавечыя ўзаемаадносіны. Сюжэты аповесцей з’яўляюцца прадуктыўным спосабам пазнання рэчаіснасці і прасторай сацыялізацыі для чытачоў, якія праз суперажыванне героям, мадэляванне разнастайных стратэгій дзеянняў і непазбежныя рэфлексіі набываюць апасродкаваны, але вельмі каштоўны жыццёвы вопыт.

***Ключавыя словы:*** мастацкая літаратура; аўтабіяграфічная проза; сацыяльнае станаўленне; маральна-этычныя прынцыпы; сацыялізацыя.

## СОЦИАЛЬНОЕ СТАНОВЛЕНИЕ РЕБЕНКА В ПОВЕСТЯХ Е. ВАСИЛЕВИЧ «ДОЛЯ ЗНОЙДЗЕ ЦЯБЕ» И «НОВЫ СВЕТ»

**Л. В. Олейник**

*Кандидат филологических наук, доцент,*
*Белорусский государственный университет,*
*пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь,*
*lada_oleinik@mail.ru*

Рассматриваются повести Е. Василевич «Доля знойдзе цябе» и «Новы свет» – центральные части тетралогии «Пачакай, затрымайся». Исследуются обстоятельства жизни, семейных взаимоотношений и этапы социального становления главной героини произведения – дере-

венской девочки. Анализируются события и факторы, способствовавшие усвоению юной героиней социокультурного опыта и ее интеграции в систему социальных отношений. Утверждается, что литературные произведения Е. Василевич позволяют глубже осмысливать и усваивать явления и законы социально-общественного бытия, определяют этические абсолюты, регламентирующие человеческие взаимоотношения. Сюжеты повестей являются продуктивным способом познания действительности и пространством социализации для читателей, которые через сопереживание героям, моделирование разнообразных стратегий действий и неизбежные рефлексии приобретают опосредованный, но очень ценный жизненный опыт.

***Ключевые слова:*** художественная литература; автобиографическая проза; социальное становление; морально-этические принципы; социализация.

## SOCIAL FORMATION OF THE CHILD IN THE STORY A. VASILEVICH «FATE WILL FIND YOU» AND «NEW WORLD»

**L. V. Aleinik**

*PhD, Ass. Professor,*
*Belarusian State University,*
*4 Independence Avenue, 220030, Minsk, Belarus,*
*lada_oleinik@mail.ru*

The article examines A. Vasilevich's short stories «Fate Will Find You» and «New World» – the central parts of the «Wait, Stay» tetralogy. The circumstances of life, family relations and stages of social development of the main character of the work – a village girl – are investigated. The events and factors that contributed to the young heroine's assimilation of sociocultural experience and her integration into the system of social relations are analyzed. It is claimed that the literary works of A. Vasilevich allow for a deeper understanding and assimilation of the phenomena and laws of social and public existence, define ethical absolutes that regulate human relationships. The plots of stories are a productive way of learning about reality and a space of socialization for readers who, through empathy with the characters, modeling of various action strategies and inevitable reflections, acquire indirect but very valuable life experience.

***Keywords:*** fiction; autobiographical prose; social formation; moral and ethical principles; socialization.

Працэс сацыяльнага станаўлення асобы мае на ўвазе засваенне правілаў грамадскага жыцця, фарміраванне каштоўнасных арыентацый, маральна-этычных прынцыпаў і навыкаў міжасабовага ўзаемадзеяння. Сацыяльная сталасць, такім чынам, вызначаецца ўзроўнем адпаведнасці паводзінаў чалавека грамадскім крытэрыям і нормам, здольнасцю да выканання сацыяльных роляў, уласцівых даросламу чалавеку. Але ў сучасным свеце, які характарызуецца шматвектарнасцю сацыяльных узаемадзеянняў і надзвычайнай дынамікай інтэрактыўных мультымедыя, накіраванасць і змест працэсу станаўлення асобы пачалі істотна змяняцца. «Перавага форм

зносінаў праз інфармацыйна-камунікатыўныя сістэмы замест міжасабовых камунікацый, звужэнне каналаў спасціжэння чалавекам рэчаіснасці (ігнараванне вялікай колькасцю людзей магчымасцей навукі, мастацтва, рэлігіі), адасабленне і «атамізацыя» прыводзяць да парушэння прынцыпа сістэмнасці атрымання ведаў пра свет, неразуменню сэнсаў з'яў і дзеянняў, іншай інтэрпрэтацыі ўчынкаў у соцыуме, неразвітасці рэфлексіі. Змяняецца ступень сацыяльнай адкрытасці і закрытасці чалавека, абмяжоўваецца набор магчымых варыянтаў сацыяльных паводзінаў, большая частка з якіх застаецца нязведанай. <…> Утвараецца няўстойлівая раўнавага, калі разбурэнне традыцый прыводзіць да няпэўнасці ў свядомасці і лёсах людзей. Бядой з'яўляецца парушэнне гармоніі паміж традыцыяй і інавацыяй, і як вынік – паміж тымі сацыяльнымі рэсурсамі (пакаленнямі людзей), якія іх узнаўляюць» [1, с. 118–119]. Безумоўна, сацыяльныя трансфармацыі, грамадскія супярэчнасці, парушэнні міжпакаленнай трансмісіі найбольшы ўплыў маюць на маладое пакаленне, максімальна ўскладняюць сацыялізацыю асобы.

Мастацкая літаратура як феномен культуры заўжды чуйна рэагавала на тэктанічныя зрухі ў сацыяльнай структуры грамадства, фіксавала і асэнсоўвала прычыннавыніковыя сувязі актуальных праблем часу. У эпоху глабалізацыі, калі трансфармуюцца этнічныя культуры і ўзнікаюць новыя стылі камунікацый, менавіта мастацкая літаратура захоўвае каштоўнасныя сэнсы і сацыяльныя патэрны, якімі традыцыйна рэгламентаваліся грамадскія ўзаемаадносіны і вызначалася нацыянальная самабытнасць беларусаў. Сярод літаратурных узораў для дзяцей і юнацтва асаблівую каштоўнасць набывае аўтабіяграфічная проза, якая амаль заўсёды накіравана на выяўленне самых істотных падзей і фактаў у жыцці лірычнага героя, на асэнсаванне этапаў яго станаўлення і непазбежна адлюстроўвае сацыяльна-гістарычныя ўмовы часу, якія ўплываюць на фарміраванне светапогляду асобы.

Аповесці А. Васілевіч «Доля знойдзе цябе» і «Новы свет» уваходзяць у аўтабіяграфічную тэтралогію пісьменніцы «Пачакай, затрымайся» і працягваюць гісторыю сталення вясковай дзяўчынкі, запачаткаваную ў аповесці «Расці, Ганька». Калі першая частка тэтралогіі знаёміла з абставінамі жыцця юнай гераіні ў сямейным атачэнні, то другая і трэцяя значна пашыраюць прастору падзей, бо ў Ганькі пачынаецца новы этап жыцця: яна выпраўляецца ў школу. Натуральна, дзяўчынка ўжо мае першы сацыяльны досвед: яна назірала за адносінамі сваёй маці са сваякамі і вясковымі суседзямі, мае ўяўленні пра асноўныя прынцыпы чалавечых стасункаў, разумее, што свет вакол яе зусім не ідэальны – у гэтым свеце ёсць чэрствасць і хлусня, зайздрасць і сквапнасць. Першая частка тэтралогіі завяршаецца трагічнымі падзеямі: памірае маці Ганькі, дзяўчынка застаецца круглай сіратой, і яе забірае да сябе матчын брат Мікалай.

Ганьцы даводзіцца сталець хутчэй, чым іншым дзецям. Яна змушана прыстасоўвацца да жыцця ў дзядзькавай сям'і: пакорліва прымаць бясконцыя папрокі і беспадстаўныя нараканні цёткі Фядоры, дагаджаць сваякам, выконваць даручаны ёй гаспадарчы абавязак і пасвіць хатнюю жывёлу. Першыя ўражанні ад школы гэтаксама не надта вясёлыя: дарога да яе далёкая, бо школа ў суседняй вёсцы; дзеці ў класе задзірыстыя; заданні настаўніка складаныя. «За першым днём вучэння ідзе другі, ідзе трэці. Так праходзіць тыдзень. А потым, пасля ўсяго аднаго толькі выхаднога дня – у

нядзелю – зноў пачынаецца першы дзень, другі дзень, трэці… Ганька прыкметна стамляецца на ўроках, адстае ад старэйшых у дарозе (і старэйшыя крычаць на яе!), не паспявае вучыць як належыць урокаў дома… Бо хоць і думалася ёй, што як пойдзе яна ў школу, то назаўсёды ўжо разлічыцца з пашай і свіннямі, – нічога з гэтага не выйшла. І свінні засталіся, і паша засталася. І цётка Фядора, ледзь толькі Ганька паспее пад’есці пасля школы, адразу ж адпраўляе яе на выган» [2, с. 148]. Але спакваля дзяўчынка прывыкае да гэтага няпростага жыцця, успрымае падзеі з уласцівым дзецям аптымізмам. У аповесці выдатна адлюстравана, як маленькая гераіня набывае новыя навыкі міжасабовых зносінаў: як вучыцца сябраваць, як засвойвае правілы грамадскіх паводзінаў, культуры, як вучыцца крыху хітраваць ці недагаворваць, каб пазбегнуць непрыемнасцяў.

Шмат пра якія падзеі даведваецца Ганька з размоў дарослых. Найбольш розных навін можна пачуць, калі да дзядзькі Мікалая, у якога ёсць уласная ваўначоска, прыязджаюць «завознікі»: едуць са ўсёй Случчыны з вялізнымі пакункамі нечасанае воўны, займаюць усю хату і чакаючы сваёй чаргі, вядуць няспешныя гаворкі. Аднак Ганька заўважае, што раней людзі гаварылі на самыя розныя тэмы, але апошнім часам – толькі пра калгасы. Адны даводзяць, што калектыўныя гаспадаркі будуць вялікай палёгкай для сялянскай беднаты, іншыя – горача супярэчаць: «Згвалтуюць людзей, хто мазалём і потам зарабіў сваё добрае. Змарнуюць гаспадаркі… Бо ўсякаму вядома, што на гаспадарцы патрэбна праца. А гэтыя гультаі, што век хлеба не маюць да Каляд, хіба яны прывыклі рабіць?! На чужое квапіцца – на гэта ўсе здольныя… Таму і калгасы патрэбны гультаям, а не гаспадарам!» [2, с. 155]. Асабліва палохаюць Ганьку чуткі пра “раскулачванне”, калі ў людзей, якія адмовіліся ад удзелу ў калектыўнай гаспадарцы, адбіраюць усю маёмасць і высылаюць «у Мурманск ці на Салаўкі, дзе ніколі зямля не адтайвае» [2, с. 155].

Тэма калектывізацыі з’яўляецца лейтматыўнай у аповесці «Доля знойдзе цябе». Менавіта гэта сацыяльная з’ява не толькі кардынальна змяніла жыццё сваякоў дзяўчынкі, але пашырыла яе асабістыя ўяўленні пра свет, пра чалавечыя характары і матывы ўчынкаў.

Першае сутыкненне з наступствамі калектывізацыі звязана ў Ганькі са з’яўленнем у дзядзькавай хаце Волькі-кулачкі – роднай пляменніцы цёткі Фядоры. Бацькоў Волькі раскулачылі і «саслалі з двума старэйшымі дзецьмі невядома нават куды», а малодшую дачку дазволілі пакінуць у сваякоў. Перадусім Ганька адчула, што да ўласнай пляменніцы цётка ставіцца па-іншаму, чым да яе: не абавязвае ніякай працай, шкадуе і песціць. Дзівіць Ганьку, што Волька зусім не перажывае пра сваіх родных: «вечарам ужо таго дня, як прыехала, <…> рагатала на ўсю хату і дражнілася з Ганькай, <…> а потым падгаварыла Валю, і яны абедзве, апрануўшыся ў кажушкі, пайшлі на вячоркі да вялікіх дзявок і хлопцаў» [2, с. 157].

З утварэннем калектыўнай гаспадаркі заўважальна змяніліся некаторыя вясковыя людзі. Дзядзька Тодар, які нічым асаблівым ніколі не вылучаўся, стаў старшынёй калгаса і зрабіўся вельмі важным – не падступіцца. Раней быў чалавекам негаваркім, стрыманым, але на новай пасадзе палюбіў склікаць сходы ды «весці іх урачыста, глыбакадумна, асабліва пакуль чытае павестку дня» [2, с. 200]. Напоўніцу разгарнулася ў вёсцы Надзя Сцёпіха – жонка роднага брата цёткі Фядоры, якая заўжды была

сварлівай кабетай, але з прыходам калектывізацыі зрабілася зусім невыноснай. «Надзі Сцёпіхі баяўся ўвесь засценак. Мусіць, не было таго чалавека, на каго б яна не пісала ў сельсавет заявы. У таго былі наймічкі (у жніво дні на два ці на тры прыходзілі памагчы сваякі з другога засценка), у другога свінні парылі поплаў, трэці вянглярню вэндзіць каўбасы паставіў блізка каля суседскага хлява, дык хацеў спаліць засценак… <…> Цяпер Сцёпісе хацелася ўсіх раскулачваць і ссылаць: на Салаўкі, у Мурманск, у Сібір…» [2, с. 202].

У аповесці выразна выяўляецца, як па меры сталення ў дзяўчынкі не толькі пашыраецца кола знаёмстваў і паглыбляецца жыццёвы досвед, але пачынаецца крытычнае асэнсаванне шматлікіх праблем, з якімі сутыкаюцца дарослыя. Усё, што адбываецца навокал, хвалюе Ганьку, схіляе да рэфлексій, змушае шмат разоў пераацэньваць свае погляды на падзеі, на людзей. «Пражыўшы ўжо амаль дзевяць гадоў на свеце, не адразу, вядома, а з нейкіх выпадковых назіранняў, Ганька пачынае паступова рабіць для сябе важнае заключэнне: як усё ж дзіўна пабудаваны свет і жыццё! Чакаеш ад яго аднаго, а яно падсоўвае табе зусім іншае. Ідзеш насустрач яму з працягнутымі рукамі, з гэтакім даверам, а яно табе раптам трах па руцэ! А то яшчэ горш… І, наадварот, выдумляеш на чалавека немаведама што, не любіш яго, а ён працягвае табе руку…» [2, с. 205].

Ганька расце назіральнай і чуйнай, не па гадах практычнай. Кемлівасць і спрыт дзяўчынкі, якіх ніхто не чакаў ад дзевяцігадовага дзіцяці, выявіліся ў самы драматычны момант, калі ўчастковы міліцыянер Гайдукевіч у суправаджэнні «ўпаўнаважанага» прыйшлі апісваць маёмасць Ганьчыных сваякоў. Сцёпіха дамаглася свайго: па яе заяве было прынята рашэнне «раскулачыць Мікалая і Фядору Гурновічаў». Але цётка Фядора, хоць і спакавала ўсё самае лепшае, што было ў яе куфрах ды шафах, схаваць дабро не паспела – спадзявалася, што ўсё «як-небудзь абыдзецца». Ганька першая ўбачыла, што ў двор кіруюць «прадстаўнікі ўлады» і кінулася ў хату. Дзяўчынка імгненна зразумела, што ад спалоханай і разгубленай цёткі не будзе ніякага толку, і ёй давядзецца самой ратаваць цётчына дабро. «І не ўсведамляючы, адкуль раптам у яе ўзялося столькі сілы, яна схапіла з-пад посцілак, з-пад хамутоў адзін клумак, другі і, папярэдне выглянуўшы за дзверы, ці няма на двары Гайдукевіча ці таго, другога, з партфелем, кінулася з клумкамі за хату, парэчнікам, за свіран, за ваўначоску… Да той падстрэшкі, дзе зусім нядаўна яна хавалася сама – ад цёткі Фядоры…» [2, с. 229]. У творы выразна падкрэсліваецца, што ні цётчына адчужанасць, ні шматлікія крыўды, якія Ганька ад яе трывала, не азлобілі дзіця: у душы і свядомасці дзяўчынкі захаваліся тыя маральныя аксіёмы, якія даводзіла ёй маці і якія зрабіліся вызначальнымі. Калі цётцы загадваюць «вызваліць хату», Ганька па-даросламу супакойвае і Фядору, і яе дочак, якія разам галосяць на ўсю вёску: «Цётка, не плачце… <…> Пойдзеце ў нашу хату… У нашай не раскулачаць больш» [2, с. 231]. Старэнькая і цесная хата, якая стаяла пустой пасля смерці Ганьчынай маці, зрабілася прытулкам для ўсёй «раскулачанай» сям'і, а сама дзяўчынка перабралася жыць да іншых сваякоў – да цёткі Іваніхі і сваіх стрыечных сясцёр. Заключныя падзеі аповесці пераканаўча выяўляюць дастатковую сфарміраванасць сацыяльных і маральных пparticularводзінаў дзяўчынкі: здольнасць узяць на сябе адказнасць, ініцыятыўнасць, арганізаванасць, але галоўнае – спагадлівасць і душэўную чуласць.

Аповесць «Новы свет» расхінае чарговую старонку ў жыцці маленькай гераіні: Ганька пайшла ў пяты клас местачковай дзесяцігодкі. Новая школа знаходзіцца далёка – аж за дзесяць вёрст ад роднай вёскі, дзеці «мераюць гэтыя вёрсты» кожныя выхадныя, а на працягу тыдня кватаруюць у мясцовых людзей. Ганька з вялікай цікаўнасцю назірае за жыццём мястэчка Урэчча, параўновае быт жыхароў з умовамі жыцця ў сваёй вёсцы. З адценнем зайздрасці яна заўважае, што ва Урэччы людзі жывуць багацей і лягчэй: «Сяло жыве сялянскай працай. Спакон веку больш сее, чым жне на пустых пясчаных палетках. Але ўсё роўна сее... Мястэчка, наадварот, жыве «лёгкім хлебам»: яно гандлюе, яно гоніць смалу на смалакурні, вырабляе скуры і шые боты і кажухі…» [3, с. 232]. Нягледзячы на тое, што вакол столькі ўсяго цікавага: і новыя знаёмыя сярод школьнікаў, і новыя настаўнікі, і разнастайныя ўстановы «культуры і ўлады» – сельсавет, сельмаг, вінзавод, аптэка – Ганьку невыносна цягне дадому. «Дадому! <…> Толькі дадому. Да непаўторнага ў маленечкіх шыбінах свету. Да шырокае печы, што страчае цябе заўсёды цяплом і прытулкам. Да вузкае, босымі нагамі і жывёлай змешанае, скапычанае вуліцы... Па сутнасці, гэта яна, вуліца, першая школа і першая настаўніца ў тваім жыцці» [3, с. 242].

Кампазіцыі аповесцяў, якія складаюць тэтралогію “Пачакай, затрымайся”, маюць ідэнтычную структуру: у сюжэтах адлюстраваны штодзённыя клопаты гераіні, яе праблемы і поспехі ў школе, стасункі ў сямейным атачэнні, назіранні за людзьмі і асэнсаванні іх адносінаў. Але ў заключных раздзелах кожнай часткі абавязкова па-мастацку рэзюмуецца, якім чынам гэтыя ўражанні паўплывалі на дзяўчынку, якія факты абумовілі яе пэўныя рашэнні або нават зрабіліся вызначальнымі ў выбары далейшага жыццёвага шляху. У аповесці «Новы свет» гаворка ідзе пераважна пра вучобу Ганькі ў дзесяцігодцы і жыццё ў мястэчку: спачатку на кватэры, пазней – у інтэрнаце. Аднак галоўныя падзеі, якія ў канчатковым выніку матывавалі дзеянні юнай гераіні, адбыліся ў яе сям’і.

Сярод усіх сваякоў Ганькай найбольш апякуецца стрыечная сястра Саша – старэйшая дачка цёткі Іваніхі. Менавіта Саша аплочвае Ганьцы жыллё на кватэры ва Урэччы, кожны тыдзень «пакуе з сабой торбу» – харчаванне да наступных выхадных. Ганька выдатна разумее, што Сашы гэтае апякунства даецца вельмі няпроста, бо ў сястры свая сям’я: муж, двое дзяцей, старая маці, гаспадарка. Дзяўчынка імкнецца дапамагчы сястры, чым можа: як толькі вяртаецца з вучобы, кідаецца прыбіраць у хаце, шчыраваць па гаспадарцы, хапаецца за любую працу. Чарговы раз, вярнуўшыся дамоў на выхадныя, Ганька даведваецца пра няшчасце, якое абрынулася на сям’ю: Валодзю, мужа Сашы, арыштавалі. Маладога гаспадара абвінавацілі ў тым, што забілася калгасная кабыл: памчала, спалохаўшыся «араплана», і наляцела ў калгасным двары на плугі ды бароны. Ганька моцна перажывае за родных: «Валодзю далі дзесяць год. Падумаць толькі, за кабылу, што сама забілася, чалавека пасадзілі на дзесяць год у турму... І няхай сабе і не сядзіць ён, а капае нейкі канал, але ж дзесяць год! Без сям’і, без дзяцей, без жонкі... А як ім тут <…> жыць гэтыя дзесяць год...» [3., с. 256].

Драма ў сям’і сваякоў кардынальна змяніла жыццёвыя планы галоўнай гераіні твора, якая першапачаткова мела намер скончыць дзесяцігодку, паступіць у інстытут і атрымаць «сур’ёзную адукацыю». Сумленне не дазваляе дзяўчынцы абцяжарваць

сястру дадатковым клопатам: Саша «не можа болей цягнуць яшчэ і яе вучэнне – яе кватэру і яе торбы штотыдня» [3, с. 341]. Ганька прымае рашэнне пасля сёмага класа паступаць у педвучылішча, бо «разумее, што сама ўласнымі сіламі павінна неяк выбівацца на ўласны хлеб. І выбівацца як мага хутчэй. А ў педвучылішчы давалі стыпендыю, давалі інтэрнат» [3, с. 341–342]. Гэтае ўзважанае і асэнсаванае рашэнне дзяўчынкі з'яўляецца не толькі сведчаннем яе сумленнасці, але перадусім – прыкметай сацыяльнай сталасці, здольнасці да рацыянальных і адказных учынкаў. Паводле меркаванняў сучасных псіхолагаў, «сацыяльны і асабісты вопыт – гэта заўсёды вынік дзеянняў дзіцяці, яго актыўнага ўзаемадзеяння з навакольным светам, аднак авалодаць вопытам – значыць не проста засвоіць сукупнасць звестак, ведаў, навыкаў, узораў, але інтэрналізаваць той спосаб дзейнасці і зносінаў, вынікам якіх ён з'яўляецца» [4, с. 122]. Заключныя падзеі аповесці «Новы свет» пераканаўча сведчаць, што пятнаццацігадовая Ганька Гурновіч насамрэч зрабілася дарослай: самастойнай, здольнай аб'ектыўна ацэньваць рэальнасць і прымаць сур'ёзныя рашэнні.

Тэтралогія А. Васілевіч «Пачакай, затрымайся» вельмі паслядоўна і псіхалагічна дакладна адлюстроўвае этапы сацыяльнага станаўлення галоўнай гераіні. Аднак менавіта дзве цэнтральныя аповесці выяўляюць найважнейшы перыяд у жыцці Ганькі, калі дзяўчынка пачынае самастойна ўзаемадзейнічаць не толькі з аднагодкамі, але і з дарослымі людзьмі, калі засвойвае тыповыя формы сацыяльных паводзінаў і пачынае вызначаць каштоўнасныя прыярытэты. Для юных чытачоў, якім адрасаваны мастацкі твор, досвед галоўнай гераіні мае несумненную карысць. Мастацкая літаратура – гэта апасродкаваны, але прадуктыўны спосаб пазнання рэчаіснасці і ўзаемадзеяння асобы з соцыумам, гэта магчымасць мадэлявання і выпрабоўвання разнастайных стратэгій дзеянняў разам з літаратурнымі героямі, гэта прастора засваення этычных абсалютаў, без якіх немагчыма функцыянаванне індывіда як сацыяльнага суб'екта.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Николаева Е. М.* Ценность традиций в социальном становлении личности // Вестник экономики, права и социологии. 2007. № 2. С. 115–119.

2. *Васілевіч А.* Доля знойдзе цябе // Выбраныя творы. Мінск: Беларуская навука, 2010. С. 133–235.

3. *Васілевіч А.* Новы свет // Выбраныя творы. У 3 т. Т.2. Мінск: Маст. літ., 1982. С. 229–344.

4. *Кожевникова Д. А.* Особенности формирования социального и личностного опыта на различных этапах детства // Известия Саратовского университета. 2012. № 4. С. 115–122.